Падтрымай "Вясну" на PATREON

Журналістаў будуць судзіць за рэпартаж на "Белсаце"

10.02.2020 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода слова

У Магілёве 8 лютага супрацоўнікі Кастрычніцкага РАУС затрымалі мясцовую журналістку Аліну Скрабунову. Крыху пазней быў таксама затрыманы журналіст-фрылансер, аператар Аляксандр Сідарэўскі, піша "Беларуская асацыяцыя журналістаў".



Аляксандр Сідарэўскі і Аліна Скрабунова. Фота: 6tv.by

Як распавяла Скрабунова, яе затрымалі ў дварэ дома супрацоўнікі Кастрычніцкага РАУС Магілёва падпалкоўнік міліцыі **Сяргей Афанасьеў** і **Андрэй Цярэнцій**. Журналістку даставілі ў Кастрычніцкі райаддзел міліцыі, дзе склалі на яе пратакол адміністрацыйнага правапарушэння“за ўдзел у незаконным вырабе прадукцыі СМІ” і пасля гэтага адпусцілі.

У міліцэйскім пастарунку журналістцы выпісалі позву з’явіцца ў суд **19 лютага.** Судзіць Скрабунову будуць паводле ч.2 арт. 22.9 КаАП (“*Незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ*”) за матэрыял пра 50-годдзе тралейбуснага парка ў Магілёве, які з’явіўся на тэлеканале “Белсат”.

Ужо пазней журналістцы вынеслі яшчэ і пратакол адміністрацыйнага затрымання, які быў складзены ўжо пасля таго, як Скрабунову адпусцілі.

Пазней па дарозе дадому быў затрыманы і дастаўлены ў Кастрычніцкі РАУС аператар Аляксандр Сідарэўскі. На яго склалі адміністрацыйны пратакол за той жа матэрыялпра 50-годдзе тралейбуснага парка. Разглядаць справу Сідарэўскага ў судзе будуць таксама **19 лютага**. Па словах журналістаў, затрыманне адбылося, калі яны збіраліся ехаць на сход кіроўцаў, якія незадаволеныя ростам коштаў на паліва.

Аліна Скрабунова ўжо прыцягвалася да адміністрацыйнай адказнасці за супрацоўніцтва з тэлеканалам "Белсат". У красавіку мінулага года суд Ленінскага раёна Магілёва пакараўяе штрафам у памеры 50 базавых велічынь (1275 рублёў).

Тады суддзя **Аксана Ратнікава** прызнала Скрабунову вінаватай ва *"ўдзеле ў незаконным вырабе прадукцыі СМІ", бо відэасюжэт пра адкрыццё інклюзіўнага кафэ ў гандлёвым цэнтры "Парк-Сіці" ў Магілёве, дзе працуюць інваліды-калясачнікі, быў паказаны на тэлеканале "Белсат"*. Журналістку абвінавацілі ў тым, што яна працуе на замежны тэлеканал без акрэдытацыі, хоць сама Скрабунова сцвярджала, што ў яе няма працоўнай дамовы ні з "Белсатам", ні з іншым замежным СМІ.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за справаны сняг

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY